# ПОЛАЦКАЕ ГАРАДЗІШЧА Ў СВЕЦЕ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АНАЛІЗ

*Ю.У. Врублеўскі*

Полацкае гарадзішча як аб'ект гістарычнага даследавання пачало вывучацца ў 1928 г. Найбольш важныя пытанні паходжання Полацка, якія датычыліся яго храналогіі і тапаграфічнай структуры былі ахарактарызаваны А.М. Ляўданскім пад час даследавання ім гарадзішча. Навуковец прыйшоў да высновы, што старжытны цэнтр горада быў заснаваны на гарадзішчы, якое знаходзілася на правым беразе р. Палаты. Для доказнасці дадзенай думкі даследчык указаў на факт наяўнасці слядоў ляпной керамікі, якая была ім датавана VIII–X стст. [1, с. 168]. Звяртаючы ўвагу на акалічнасць складвання Полацка ў ранні дагарадскі перыяд, А.М. Ляўданскі акрэсліў тапаграфічнае прызначэнне полацкага гарадзішча як першапачатковага цэнтра горада, які выконваў сваю ролю да XII ст. Распачаўшы археалагічнае вывучэнне Полацка, А.М. Ляўданскі атрымаў важныя высновы аб узнікненні горада, якія і сёння захоўваюць сваю актуальнасць.

З даследаванняў А.М. Ляўданскага гарадскія пасяленні Полацка даволі працяглы час не вывучаліся навукоўцамі. Археалагічныя даследаванні Полацка былі ўзноўлены ў 1957 г. раскопкамі на Верхнім замку. Вывучэнне Полацкага гарадзішча было працягнута Г.В. Штыхавым. Прарэзка вала на гарадзішчы дазволіла гісторыку вызначыць храналагічныя межы ўзвядзення старжытнага ўмацавання і тым самым пацвердзіць гіпотэзу А.М. Ляўданскага аб ролі гарадзішча на правым беразе Палаты як градафарміруючага цэнтра [2, с. 23–26]. Не аспрэчваючы вартасці дадзеных заключэнняў, пажаданна зрабіць агаворку аб дацiроўцы гарадзішча. Адзінкавасць матэрыялаў VIII–IX стст. на гарадзішчы наўрад можа ўпэўніць у верагоднасці афармлення азначанага прамежку ніжэйшымі храналагічнымі межамі існавання Полацка. Храналагічныя дацiроўкі складвання гарадскіх пасяленняў у ранні перыяд (IX–X стст.) павінны абапірацца на вызначальныя матэрыяльныя прыкметы гарадскога жыцця, такія як сляды кругавой керамікі, шыферныя праслiцы, шкляныя бранзалеты, манеты. Аб наяўнасці некаторых з гэтых элементаў гарадской культуры ў напластаваннях гарадзішча зазначае Г.В. Штыхаў. Разам з тым, не ўсе знаходкі даюць нам дакладнае ўяўленне аб часе іх з'яўлення. Таму, для таго каб знайсці пацвярджэнні існавання Полацка ў VIII і нават IX ст. неабходна абапірацца на больш надзейныя аргументы. Больш правільным

уяўляецца сцвярджэнне навукоўца аб тым, што Полацк тапаграфічна аформіўся ў IX – першай палове X ст. і абмяжоўваўся гарадзішчам і селішчам [2, с. 26].

У артыкуле «Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст.» Д.У. Дук выклаў асабісты погляд на праблему тапаграфіі горада. У 2007 г. даследчыкам археалагічна вывучана 44 кв. м. гарадзішча і атрымана інфармацыя, якая дазволіла яму па-новаму ахарактарызаваць ролю першапачатковага цэнтра на Палаце. Абапіраючыся на матэрыялы раскопак, Д.У. Дук асвятляе пытанні сацыятапаграфічнага прызначэння полацкага гарадзішча. Так, гісторыкам зазначаецца, што гарадзішча з'яўлялася надзейным і адзіным месцам пражывання княскай адміністрацыі да канца XIII ст. Не менш арыгінальным з'яўляецца і сцвярджэнне аб размяшчэнні на полацкім гарадзішчы царквы XII ст. [3, с. 30]. Пытанне аб размяшчэнні рэзідэнцыі полацкіх князёў адносіцца да ліку дыскусійных і не да канца вырашаных. Калі звярнуць увагу на памеры полацкага гарадзішча (каля 1 га) і на яго месцазнаходжанне, то можа ўзнікнуць пытанне аб мэтазгоднасці выбару гэтага месца для размяшчэння тут рэзідэнцыі. Д.У. Дук спрабуе абгрунтаваць свой погляд знаходкамі спецыфічных археалагічных матэрыялаў на гарадзішчы. Па меркаванні гісторыка, Верхні замак Полацка, які верагодней быў больш прыстасаваны для выконвання ім ролі адміністрацыйна-палітычнага цэнтра горада, з'яўляўся адміністрацыйна-цырымоніяльным цэнтрам [3, с. 27]. Разважанні Д.У. Дука аб прызначэнні пасялення на тэрыторыі Верхняга замка ў XI–XIII стст. падпарадкоўваюцца ідэі ўзвелічэння ролі полацкага гарадзішча як добра ўмацаванага адміністрацыйнага цэнтра. Калі дапусціць меркаванне Д.У. Дука аб цырымоніяльным прызначэнні Верхняга замка, то патрабуе свайго тлумачэння факт узвядзення царквы XII ст. на гарадзішчы з нязначнай плошчай, дзе знаходзілася рэзідэнцыя. Між тым яшчэ ў 2002 г. да раскопак на гарадзішчы Д.У. Дук у артыкуле «Состояние, актуальные проблемы и перспективы развития археологии Полоцка» прапанаваў альтэрнатыву полацкаму гарадзішчу як цэнтру ўтварэння горада.

Параўноваючы асаблівасці тапаграфічнай структуры Ноўгарада і Полацка, Д.У. Дук прыйшоў да цікавай высновы аб тым, што для апошняга было характэрным фарміраванне пасадаў сінхронна часу існавання гарадзішча [4, с. 26]. Магчыма пагадзіцца з тым, што на пачатковай стадыі развіцця тапаграфія горада мела монацэнтрычны характар: дзядзінец (гарадзішча) – пасады-вакольны горад (левы бераг Палаты) і развівалася па веерна-радыяльнай схеме [4, с. 25].

Павышэнне ўвагі да праблем ранняй гісторыі Полацка асабліва ўзрастае ў сувязі з адкрыццём новых храналагічных даціровак. Выкарыстанне радыевугляроднага метаду падчас раскопак полацкага гарадзішча ў 2007 г. дазволіла Д.У. Дуку атрымаць адносна шырокія межы (660–780 гг.) адпраўной гісторыі горада. З мэтай высвятлення магчымых і больш дакладных храналагічных межаў узнікнення Полацка ў 2009 г. была арганізавана археалагічная экспедыцыя ў складзе М.В. Клімава і П.М. Кенькі. Выяўленне слоя пажарышча полацкага гарадзішча, у які трапілі фрагменты дырхемаў, дазволіла навукоўцам ўнесці карэкціроўку ў тлумачэнне пачатковай гісторыі горада. На погляд М.В. Клімава, манеты маглі знаходзіцца ў абароце на працягу 820–840 гг. і захоўвацца ў драўляных пабудовах, якія аказаліся ў вогнішчы [5, с. 6]. Адкрыццё новай і вузкай даціроўкі ранняй гісторыі Полацка ўяўляецца важнай падзеяй у айчыннай навуцы.

Правядзенне гістарыяграфічнага аналізу археалагічнага даследавання старажытнага цэнтра Полацка і ўзважванне асноўных дасягненняў навукоўцаў у галіне вывучэння ранняй гісторыі горада дазваляе зазначыць, што гісторыя археалагічнага вывучэння Полацка і яго помнікаў мае багатую традыцыю і ўяўляе сабой актуальны кірунак даследавання. На раду з пытаннямі, якія не выклікаюць спрэчак і сумненняў застаюцца праблемы, што патрабуюць свайго далейшага вывучэння (месцазнаходжанне княжацкай рэзідэнцыі Полацка, удакладненне даціровак ніжэйшых межаў існавання Полацка).

### *Літаратура*


1. Ляўданскі, А.Н. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе / А.Н. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. – 1930. – Т. 2. Кн. 2: Працы археолёгічнай камісіі. – С. 157–198.
2. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк IX–XIII вв. / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 165 с.
3. Дук, Д. Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 11. – С. 25–31.
4. Дук, Д. От вассалитета до равноправия / Д. Дук // Родина. Российский исторический журнал. – 2009. – № 9. – С. 23–26.
5. Клімаў, М.В. Новае адкрыццё ў храналогіі старажытнага Полацка / М.В. Клімаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 5. – С. 5–7.




## ДИПЛОМАТИЧЕСКАЯ МИССИЯ ПНР В ФРГ В 1954-1959 гг.

*Л.В. Гавриловец*

В середине 1950-х гг. польская дипломатическая миссия занялась подготовкой ряда документов в области установления консульских отношений с ФРГ. Причиной таких изменений явилась смена установок в центральном